Парады бывалых

СТУДЭНТ І ЗДЫМНАЕ ЖЫЛЛЁ

Чаго чакаць, на што разлічваць?

Кажуць, што калі падчас вучобы ва ўніверсітэце ты не жыў у інтэрнаце, то і сапраўдны смак студэнцтва не адчуў. Але для многіх хлопцаў і дзяўчат яно звязана са здымным жыллём. Мы папрасілі студэнтаў (былых і цяперашніх) расказаць пра ўласны «кватэрны побыт».

Выпускнік БДУ Аляксандр ШЭЛЕГАЎ на першых курсах вучобы «выбіваў» сабе інтэрнат удзелам у грамадскім жыцці ўніверсітэта, але ў пэўны момант прамяняў яго на здымную кватэру.

— Проста зразумеў: для мяне гэта больш не варыянт. І насамрэч з'явіліся прычыны, каб адмовіцца ад ложкамесца на чацвёртым курсе, як бы дзіўна гэта ні прагучала. У інтэрнаце нельга захоўваць веласіпед, а я люблю паганяць на ім па горадзе, тым больш што ў Мінску для гэтага створаны ўсе ўмовы. Вядома, яго можна пакінуць на дварэ, але гэта небяспечна: і крадзяжы здараюцца, і дождж са снегам моцна псуюць асобныя дэталі. Таксама час ад часу ўзнікалі непаразуменні з суседзямі па пакоі з-за таго, што для мяне галоўнае — праца, а для іх — адпачынак. І менавіта тады я пачаў зарабляць столькі, што ўжо мог дазволіць сабе здымнае жыллё.

Сёння Саша жыве ў двухпакаёвай кватэры разам з двума такімі ж выпускнікамі, як ён сам. Суседзяў хлопец шукаў праз сацыяльныя сеткі: даў аб'яву і чакаў, пакуль адгукнуцца знаёмыя альбо знаёмыя знаёмых. На яго думку, спачатку лепш вызначыцца з суседзямі і толькі потым ужо разам пачынаць пошукі кватэры.

— Прыкладна паўтара месяца мы патрацілі на тое, каб разгледзець усе варыянты, якія знайшлі ў інтэрнэце. Адабралі каля дзесяці і ездзілі іх паглядзець. Самым галоўным для нас, напэўна, былі месцазнаходжанне жылля і яго плошча. У выніку спыніліся на гэтай кватэры, бо яна ў цэнтры горада і тут можна паставіць нашы веласіпеды, — кажа хлопец і паказвае калідор, прастору якога амаль поўнасцю займаюць два ровары.

Саша жыве ў асобным пакоі, за сцяной — суседзі. Кожны плаціць па 115 долараў у месяц, для маладых спецыялістаў — дарагавата, затое кватэра ўтульная, «з рамонтам» і побач з метро.

— Ніхто не сочыць, у колькі я вяртаюся дадому ці каго прыводжу ў госці. Аднойчы мы запрасілі да сябе шмат сяброў, але, зразумела, стараліся паводзіць сябе ціха, бо гэта ж не наша жыллё, — кажа Саша. — Падабаецца яшчэ і тое, што ніякіх строгіх правілаў наконт прыбірання ў нас няма. Можам і разам парадак навесці, можам і па чарзе «падзяжурыць», а можам за пяць хвілін да прыходу гасцей, як сёння. Гатуем звычайна асобна і ў розны час. Вайны за пліту ці ванны пакой у нас не бывае. Магчыма, таму што мы хлопцы...

Для **Андрэя ЖДАНОВІЧА, студэнта пятага курса БНТУ,** той факт, што месца ў інтэрнаце яму не дадуць, стаў непрыемным сюрпрызам непасрэдна ў дзень засялення.

— Дагэтуль я там жыў некалькі курсаў, хаця і не меў ніякіх ільгот, але спадзяваўся на лепшае, — успамінае Андрэй. — Напрасіўся пераначаваць у далёкага сваяка і праз сяброў-знаёмых пачаў пошукі кватэры. Як па мне, гэта самы хуткі і надзейны спосаб: табе дакладна не параяць дрэнны варыянт, не падмануць і не кінуць, адабраўшы грошы.

Знаёмы ўзяў Андрэя да сябе на падсяленне, але ў тым жа годзе ён скончыў універсітэт і з'ехаў з Мінска працаваць па размеркаванні. Цяпер пяцікурснік адзін займае другі паверх невялікага дома ў прыватным сектары. Унізе жыве гаспадыня — бабуля 83 гадоў.

— За жыллё плачу 150 рублёў, частку з якіх зарабляю сам, а частку даюць бацькі. Паколькі я дапамагаю гаспадыні па гаспадарцы, то аплату за камунальныя паслугі з мяне не бяруць. У цэлым яна вельмі добра да мяне ставіцца, без залішняй увагі. Ведаю ад сяброў пра такіх гаспадароў, што любяць усунуць свой нос у чужое жыццё. Мне ў гэтым плане пашанцавала. З другога боку, час ад часу бывае сумна аднаму, у інтэрнаце, зразумела, жыццё больш насычанае. Можна было сабрацца вялікай кампаніяй. Зараз да мяне прыходзяць сябры, але гэта ўжо не тое... Асабліва не «пагалдзіш». Гаспадыня хоць і сталага ўзросту, але чуе добра. Бывае, рыхтуюся да кантрольных ці экзаменаў ноччу, хаджу па пакоі туды-сюды, а яна мне ранкам: «Ты чаго не спаў?»

Асноўная праблема, з якой сутыкнуўся Андрэй, жывучы на кватэры, — адсутнасць інтэрнэту. Гаспадыня ў ім ніякай патрэбы не мела, таму і не праводзіла, а маладому чалавеку, ён, вядома, неабходны: «Падключаць нешта ў сваім доме бабуля адмаўлялася, бо баялася, што за ўсё ёй прыйдзецца плаціць самой. Тады я зрабіў гэта без яе дазволу, але хутка праўда адкрылася: з-за новага кабелю, які я правёў за свой кошт, тэлефонная сувязь стала лепшай. Атрымалася, што і я, і яна засталіся ў выйгрышы».

Вялікі плюс здымнага жылля: гатаваць можна, калі душа і страўнік пажадаюць.

Студэнт чацвёртага курса БДУІРа Пётр ЗАЯЦ і рады быў бы засяліцца ў інтэрнат, але месца для яго не хапіла. Затое ўніверсітэт дапамог з пошукамі кватэры.

— Перад пачаткам навучальнага года мне прапанавалі адрасы жылля, дзе чакаюць менавіта студэнтаў. Цяпер я здымаю пакой у кватэры, дзе жывуць і гаспадары — муж і жонка. Прыемныя людзі. Калі засяляўся, яны адразу сказалі: можаш прыводзіць у госці сяброў ці дзяўчыну, ты малады, і мы ўсё разумеем. Гаспадыня нават гатуе мне ежу, я толькі загадзя прадукты набываю. За гэта ёй, вядома, асобны вялікі дзякуй! — кажа Пеця. — А на першым курсе мы з аднакласнікам жылі на кватэры ў жанчыны даволі сталага ўзросту. Дык гэта было няпроста. Яна пастаянна забывалася выключыць ваду ці святло, а пасля абвінавачвала нас. Таму ўсім, хто цяпер знаходзіцца ў пошуках жылля, раю: глядзіце не толькі на ўмовы, але і на гаспадароў. Лепш, калі вы адразу знойдзеце з імі агульную мову.

Пры ўсім камфорце, што сёння ёсць у хлопца, ён бы ўсё роўна не адмовіўся жыць у кватэры без гаспадароў. У наступным семестры Пеця збіраецца шукаць новае месца, каб здымаць яго разам з сябрамі, тады і грошай прыйдзецца аддаваць больш. За цяперашні пакой яго бацькі плацяць 80 долараў.

— Да таго часу трэба будзе ўладкавацца на працу, каб самому вырашаць пытанне з аплатай. Хочацца цалкам ні ад каго не залежаць, а пакуль гаспадыня чымсьці нагадвае мне маці. Бывае, выходжу куды-небудзь увечары, а яна мне: «Ты куды?» Гэта не дрэнна, проста я адчуваю: надыйшоў час станавіцца дарослым і самастойным.

Ганна КУРАК,
студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Усё атрымаецца!

«Партал» у самастойнасць

Да яе добра прывучае інтэрнат

Ідзе ўжо каторы месяц навучальнага года. Іншагароднія студэнты, каму пашчасціла, увесь гэты час жывуць у інтэрнатах. Я вырашыла даведацца пра рамантыку і будні іх новага жыцця.

Надзея ЛАЗЕРКА, студэнтка І курса біялагічнага факультэта БДУ. Жыве ў інтэрнаце БДУ №10:

— Тут новыя для мяне ўмовы, нязвыкла было па першым часе, затое ёсць і добрыя моманты. Напрыклад, цудоўныя суседзі: дапамагаем адно аднаму ў вучобе, разам бавім час. Сярод мінусаў — няма сваёй прасторы і асабістага часу. Я не магу застацца самнасам з уласнымі думкамі. Здараецца, перашкаджаюць спаць, вучыцца, ці я сама замінаю іншым. Даводзіцца вучыцца самастойнасці, ужывацца з людзьмі.

Галіна ЖЭРКА, студэнтка І курса перакладчыцкага факультэта МДЛУ. Жыве ў інтэрнаце №3 універсітэта:

— Я заўсёды лічыла, што інтэрнат — гэта супермега-крута: заўсёды весела і цікава, галоўнае, каб суседзі добрыя былі. Але ўсё аказалася не так казачна. Мне не пашчасціла засяліцца ў студэнцкую вёску, мой інтэрнат не такі ўжо і новы, таму, каб зрабіць гэта месца ўтульным, я прывезла дыван, столік, цацкі. Вялікі мінус інтэрната — катастрафічны недахоп месца. Мне няма куды класці рэчы. Яшчэ тут даволі складана штосьці вучыць, асабліва калі ты і твае суседзі вучаць мовы, і вам трэба практыкаваць вымаўленне слоў. Складана сканцэнтравацца, але амаль паўсюдна ёсць пакоі для самападрыхтоўкі. Можна заставацца ў бібліятэцы ва «ўніверы» і вучыць там.

Паліца і гітара Ганны БОНДАР.

Мне вельмі пашчасціла з суседкамі, мы пасябравалі, разумеем адна адну, гатуем разам, таму з харчаваннем праблем няма. Наконт самастойнага жыцця: не так гэта і складана. Адзінае, трэба разлічваць грошы, разумець, на што яны спатрэбяцца, і траціць іх з розумам.

Вікторыя ПАЎЛЮЦЬ, студэнтка І курса аўтатрактарнага факультэта БНТУ. Жыве ў інтэрнаце №4 універсітэта:

— Я ведала, у якіх умовах давядзецца жыць, таму што ўжо даводзілася сустракацца з інтэрнатамі падчас удзелу ў алімпіядах і пленэрах. Мой чацвёрты «рэкламавалі» як самы дрэнны з усіх інтэрнатаў БНТУ. Але ў мяне цудоўныя суседкі. Мы агульнымі сіламі ўсё ўпарадкавалі, зрабілі пакой утульным. Мэблі было няшмат, таму кожная везла патроху: хто — паліцы, хто — тумбы, хто — стол. Месца ледзьве хапае чатыром, але мы прывыклі. Галоўныя недахопы — стары будынак і адзін душ на ўсіх. З «плюсаў» інтэрната — мноства новых знаёмстваў і магчымасць адчуць, што такое самастойнае жыццё, якога я дарэмна баялася.

Аліна МІРОНЧЫК, студэнтка І курса Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ. Жыве ў інтэрнаце №1 універсітэта:

— Спачатку было цяжка, бо прыйшлося выйсці з зоны камфорту. Тут усё іншае: маленькі халадзільнік на сем чалавек, адна паліца для талерак і посуду, пліта са свамі асаблівасцямі, невялікая шафа, інтэрнэт адсутнічае, люстэрка няма! Нягледзячы на ўсе праблемы, паступова прыстасавалася, нават пачало падабацца. Новыя людзі, ты сам па сабе і ні ад кога не залежыш. Ды і плаціць за інтэрнат трэба значна меней, чым за кватэру ў Мінску.

Крысціна ГУНЕВА, студэнтка III курса педыятрычнага факультэта БДМУ. Жыве ў інтэрнаце №2 універсітэта:

— У мяне здарылася цэлая гісторыя з засяленнем. Каб аформіць усе дакументы, спатрэбіліся два напружаныя дні. Пакуль стаяла ў чарзе на засяленне, такога наслухалася... А пасля прыйшла ў свой двухмесны пакой. Суседка — прыемная, спакойная дзяўчына... У нас няма ні халадзільніка, ні дывана. На матрацах балюча спаць. Пакуль не прывезла свой, начавала ў мінскай сяброўкі. Зараз пакрысе ствараю ўтульнасць.

Ганна БОНДАР, студэнтка II курса лячэбнага факультэта БДМУ. Жыве ў інтэрнаце №4 ужо другі год:

— У першыя дні мне ўсё было дзіўным. Нягледзячы на тое, што былі пройдзены ўсе «кругі» алімпіяды, падчас якіх жыла ў розных інтэрнатах. Спачатку тэлефанавала маці амаль са слязьмі. Але паступова прызвычаілася і да агульнага душа, аднаго на пяць паверхаў. Цяпер пра жыццё тут думаю толькі ў пазітыўным ключы. Вакол ёсць добрыя людзі, якія заўжды дапамогуць. Нават калі б з'явілася магчымасць пераехаць у іншы інтэрнат, засталася б са сваімі.

Мне падабаецца інтэрнацкае жыццё, бо тут заўсёды штосьці адбываецца. Мяркую, інтэрнат — адзін з абавязковых складальнікаў студэнцкага жыцця. Не толькі дамашнім справам тут вучышся, але і чамусьці больш важнаму, напрыклад узаемаразуменню. Таму мне крыху шкада тых, хто ў свае студэнцкія гады гэтага не меў. Не праз тое, што згубілі нейкую магчымасць павесяліцца, — яны так і не атрымалі ўрок самастойнага жыцця. А ён тут не толькі ў тэорыі, але і на практыцы.

Паліна ЗАБЕЛА,
вучаніца 11 класа гімназіі №1 г. Слуцка.